■ Ці чулі?

# МЯСА «З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ»

**Апошнім часам з'яўляецца ўсё больш прадукцыі з выкарыстаннем нацыянальнага арнаменту: футболкі, кашулі, гадзіннікі... Днямі шэраг такіх прадметаў папоўніла... рашотка для грыля. Такую прыладу з каваным арнаментам выпусціла вядомая кампанія, якая займаецца вытворчасцю алкагольных напояў.**

Ідэя стварэння «выкаванкі» (менавіта так назвалі навінку) з'явілася ў сацыяльных сетках. У працэсе смажання мяса на страве будуць адбівацца ўзоры з рашоткі. Першая партыя з дзесяці асобнікаў выканана ўручную з металу і дрэва. Вытворцы паведамляюць, што такім крокам яны падтрымліваюць цікавасць спажыўцоў да нацыянальных сімвалаў і культуры. У кампаніі абяцаюць, што калі навінка атрымае папулярнасць, то рашотка з арнаментам будзе запушчана ў серыю. Мяркуецца, што «выкаванка» можа стаць адным з турыстычных сімвалаў Беларусі.

— Мне такая інтэрпрэтацыя падаецца вельмі сумніўнай, — лічыць **этнакультуролаг Янка КРУК**. — Бо, па-першае, арнамент — гэта вельмі сакральны сімвал, які ўжываўся на знакавых прадметах — на адзенні, ложку, у аздабленні вокнаў. А па-другое, кожны ўзор мае свой сэнс. Калі на грылі размешчаны «васьмірог», то я не разумею, што хацелі сказаць гэтым вытворцы. Бо васьмівугольная зорка сімвалізуе сабой каляндар, асноўныя славянскія святы. Можа, так гэта кампанія і тлумачыць, маўляў, прыйшло свята — даставай пляшку?.. Таму я стаўлюся да такой задумы негатыўна.

Тавараў з «нацыянальным каларытам» у нас сёння ці не зашмат. І гэта, безумоўна, добра, бо як-ніяк абуджае цікавасць да нашай гісторыі і агульнай спадчыны. А ўжо ці дазваляць народным каштоўнасцям знаходзіцца на кавалку мяса ці на ніжняй бялізне — справа адукаванасці і павагі да традыцый і гісторыі саміх спажыўцоў, гэта значыць, нас з вамі.


onliner.by

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# І ЧЫПСЫ НЕ ПЕРАШКОДЗЯЦЬ ГЛЯДЗЕЦЬ КІНО Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

**Арт-кінатэатр расчыніў учора свае дзверы для гледачоў на праспекце Дзяржынскага ў Мінску.**

Арт-кінатэатр мае дзве кіназалы: вялікую і малую. У вялікай зале размяшчаецца 225 месцаў, у малой — 120. Тут ёсць дзве катэгорыі сядзенняў для гледача — звычайныя месцы, дзе размешчана камфортная мэбля з падлакотнікамі, і VIP-месцы — канапы, якія прадаюцца як асобнае месца.

— Недалёка ад нас знаходзіцца кінатэатр «Бярэсце», але ў нас добрасумленная канкурэнцыя. Канкурэнцыі, у прынцыпе, баяцца не варта, паколькі ў кожнага кінатэатра ёсць свая мэтавая аўдыторыя. Таму мы спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час знойдзем свайго гледача, які будзе любіць нас, мы будзем любіць яго, і нам будзе зручна працаваць, — паведаміла **намеснік дырэктара па маркетынгу Наталля ДЗЯМЧУК.**

Акрамя вентыляцыйнай сістэмы, у кіназалах усталяваны кандыцыянеры: 3 — у вялікім і 2 — у малым. У фае размешчаны бар, дзе можна купіць папкорн, чыпсы, напоі. Дарэчы, прадукты прадаюцца ў бясшумных упакоўках, каб не стварэць нязручнасці гледачу, які сядзіць побач.

Акрамя сусветных прэм'ер, тут будуць праходзіць тэматычныя вечары, арт-кіно, прымеркаваныя да якой-небудзь падзеі.

Кошт квітка залежыць ад сеанса, катэгорыі месца і прэм'ернага фільма. Напрыклад, раніцай цана складае 30 000 рублёў, днём — 40 000 рублёў, вечарам — 50 000 рублёў, VIP-месцы ў любы час — 200 000 рублёў.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# КУРОРТЫ ПАВЫШАНАЙ НЕБЯСПЕКІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Праўда, на выбар беларусамі курорта сітуацыя не надта паўплывала. Змяншэнне турыстычнага патоку на гэтым напрамку — 15-20 працэнтаў (для параўнання: продажы пуцёвак у Егіпет у 2011 годзе з прычыны беспарадкаў у рэгіёне ўпалі ў два разы, а паток на Украіну летась знізіўся ў тры разы). Устойлівую цікавасць да Туніса турфірмы тлумачаць унікальнасцю напрамку і адсутнасцю альтэрнатывы: па коштах тое ж самае, што Егіпет ці Балгарыя, але культурная праграма і ўмовы зусім іншыя. Хаця адмовы ад паездак ёсць (па мерках аператараў, гэта адзінкі). У Дэпартамент па турызме штодзень тэлефануе 4-5 чалавек, якія хочуць памяняць краіну адпачынку ці вярнуць грошы за тур. Нядаўна, напрыклад, прыходзіла група урачоў, 24 чалавекі: калектыў цалкам адмовіўся ад паездкі на Міжземнамор'е.

У спісе неспрыяльных для турызму краін сёлета не толькі Туніс. Некаторыя дзяржавы Аравійскага паўвострава і Далёкага Усходу таксама ў шэрагу небяспечных. Прычына — каранавірус. Сусветная арганізацыя аховы здароўя і Міністэрства аховы здароўя адсочваюць сітуацыю ў рэгіёнах, дзе былі ўспышкі захворвання. Аматарам падарожжаў раяць часова адкласці паездкі ў Паўднёвую Карэю, Манголію, Кувейт, Саудаўскую Аравію і нават у любімыя многімі турыстамі Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.

Нашым людзям, якія грошы на адпачынак прывыклі збіраць на працягу цэлага года, адмовіцца ад тура ў многім не дае фінансавы складнік.

— Кошт пуцёўкі цалкам, верагодна, вярнуць будзе немагчыма, таму што агенцтва на гэтыя сродкі браніруе гасцініцу, набывае білеты. Аднак мы просім кампаніі ісці на кампрамісы з турыстамі і рабіць захады па змяншэнні расходаў людзей, — кажа **галоўны юрысконсульт аддзела маркетынгу і якасці турыстычных паслуг Дэпартамента па турызме Аляксандр КРЭЧАТАЎ.**

Калі чалавек адмаўляецца ад пуцёўкі, фірма павінна вярнуць яе кошт за вылікам рэальных расходаў. Аператару ў распісцы трэба пазначыць не толькі суму, але і яе падрабязную расшыфроўку: столькі аддалі за нумар у гатэлі, столькі — за трансфер і паслугі гіда, у якога ўжо распланавана суправаджэнне груп. Зразумела, чым больш прамежак часу застаецца да пачатку падарожжа, тым вышэйшая верагоднасць атрымаць свае грошы назад (бо ў агенцтва яшчэ ёсць магчымасць рэалізаваць гэты тур). Калі паездка адбудзецца толькі праз два-тры месяцы, кампаніі могуць вярнуць да 90 працэнтаў кошту пуцёўкі. Розныя штрафныя санкцыі, якімі часам пужаюць турыстаў, — прыдумкі аператараў. Згодна з беларускім заканадаўствам, нельга ўтрымліваць з кліента, які адмаўляецца ад тура, нейкія працэнты звыш фактычных расходаў.

— Многія фірмы зараз кажуць, што патрэбна афіцыйная заява ад дзяржаўных органаў, каб была падстава для вяртання грошай. На самай справе, падставай з'яўляецца жаданне заказчыка. Не мае значэння, з якой прычыны ён вырашыў не ехаць у падарожжа, — каментуе юрыст.

Увогуле, інфармацыя, звязаная з эпідэміямі, катастрофамі, неспрыяльным становішчам у краіне, — першае, што агенцтву неабходна даводзіць да турыста. Калі чалавек едзе адпачываць асобна, то перад тым, як заключыць дагавор, ён павінен атрымаць у фірме інструктаж. У выпадку з групавымі турамі правілы паводзін у тых ці іншых сітуацыях распісвае на пачатку падарожжа кіраўнік групы. Дарэчы, калі чалавек ужо паехаў у Туніс, але цяпер адчувае пагрозу свайму жыццю і хоча пакінуць краіну, ён можа праз кіраўніка групы звязацца з кампаніяй, каб тая арганізавала яму вяртанне ў Беларусь. Прычым вяртанне павінна ажыццяўляцца на тых жа умовах, на якіх турыст ехаў на курорт.

У дэпартамент зараз паступаюць пытанні наконт таго, ці будзе забаронены выезд нашых грамадзян у Туніс. Па словах Аляксандра Крэчатава, спыніць турыстычны паток на Міжземнамор'е з прычыны таго, што там адбываюцца тэрарыстычныя акты, міністэрства не можа. Ёсць закон аб парадку выезду і ўезду грамадзян Беларусі, дзе выразна прапісаны падставы для абмежавання праваў на выезд, і сітуацыя з Тунісам пад іх не падпадае. Тут ужо турыст вырашае самастойна: адмовіцца ад пуцёўкі на карысць больш бяспечнага курорта ці рызыкнуць і адправіцца па запланаваным маршруце.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*


Фота Івана КУПАРВАСА.

# БЯЛІЗНА І ПОСУД ЯК ПРЫКРЫЦЦЁ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У гэтай гісторыі канец шчаслівы: бабуля хутка спахапілася, і ўсіх трох міліцыя затрымала яшчэ да таго, як яны паспелі патрацiць грошы (пакуль купюры — рэчавы доказ, але потым іх вернуць пенсіянерцы). Старая апазнала зламыснiц (іх узрост — 21, 22 і 28 гадоў), а вынікі экспертыз пацвердзілі, што менавіта гэтыя жанчыны абакралі пенсіянерку. Цяпер махляркі знаходзяцца пад вартай.

Па словах **афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандра ГЕРАСІМАВА**, гэты выпадак не адзінкавы. Апошнім часам падобныя злачынствы здзяйсняліся ў розных раёнах сталіцы. Да пенсіянераў, якія адзінока пражываюць, махляры прыходзяць пад выглядам газавікоў, сацыяльных работнікаў, прадстаўнікоў ЖЭС і крадуць грошы і іншыя каштоўнасці. А напярэдадні, каб «ацаніць становішча», патэнцыйных ахвяр наведваюць прадаўцы посуду і пасцельнай бялізны.

Лета для такіх ашуканцаў — «ураджайная» пара. Гараджане на адпачынак з'язджаюць на мора ці на лецішчы, і старыя бацькі на колькі тыдняў застаюцца адны. Пажылых родзічаў варта папярэджваць аб падобных выпадках, каб тыя былі больш пільныя. Калі ў кватэру настойліва просіцца незнаёмы электрык ці сацработнік, трэба праверыць інфармацыю: патэлефанаваць у названую арганізацыю і спытаць, ці не накіроўвалі яны спецыяліста па дадзеным адрасе. Інфармацыю пра зламыснікаў добра было б змяшчаць на жыроўках ці стэндах у паліклініках — там, дзе пенсіянеры дакладна яе заўважаюць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Май на ўвазе!

# ГРАШОВЫХ ФАЛЬШЫВАК СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ

**За першае паўгоддзе 2015-га ў Беларусі зарэгістравалі на 22,3% больш фактаў фальшываманецтва, чым за аналагічны перыяд летась, пра што паведамілі ў прэс-службе Міністэрства ўнутраных спраў.**

Для правапарушэння зборшага выбіралі амерыканскія долары (252 факты). Амаль трэціна прыпадае на расійскія рублі (137), крыху больш за 11% — на еўра (53), каля 5% (25) — на беларускія рублі. Праваахоўнікі выявілі тры факты збыту падробленых кітайскіх юаняў, адзін — украінскай грыўні.

Між іншым, супрацоўнікі падраздзяленняў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі з абароту канфіскавалі 1136 падробленых банкнот: 826 — долары ЗША, 183 — расійскія рублі, 87 — еўра, 36 — беларускія.

У «топе» сярод падробленых грошай — банкноты наміналам 100 долараў, 5 тысяч расійскіх рублёў, 100 і 50 еўра, 50 і 200 тысяч беларускіх рублёў. Найбольшая колькасць фальшывых грошай увезена ў краіну з Расіі, Літвы, Польшчы і Украіны.

Час ад часу грамадзяне жадаюць абмяняць сувенірныя грошы: за першае паўгоддзе зарэгістравана 116 падобных выпадкаў. Варта памятаць, што на вырабах, якія імітуюць долары ЗША, маецца тэкст «Не з'яўляецца плацежным сродкам», на расійскіх рублях — «Билет банка прыколаў» ці «Не з'яўляецца плацежным сродкам», на банкнотах еўра — «Souvenir Production».

Міністэрства ўнутраных спраў раіць грамадзянам праводзіць усе валютныя аперацыі ў спецыяльна прызначаных для гэтага установах, не купляць валюту з рук і не ўдзельнічаць у сумніўных здзелках.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

## ЗБЯРОМ ПАРТФЕЛЬ ПЕРШАКЛАСНІКУ

**Дабрачынная акцыя «Партфель першакласніка» стартавала ў Мінску, пра што паведамілі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**

Дапамагчы малазабяспечаным і шматдзетным сем'ям сабраць дзяцей у школу можна да 25 жніўня ў буйных гандлёвых пунктах сталіцы (ГУМе, ЦУМе, універмагах «Беларусь» і «Кірмаш», у гандлёвым доме «На Нямізе»). Прыняць удзел у акцыі можа кожны ахвотны: у адным з гэтых магазінаў трэба купіць школьныя прылады, прызначаныя для будучых першакласнікаў. Валанцёры перададуць падарункі ў «Беларускую асацыяцыю шматдзетных бацькоў». Акрамя таго, можна пералічыць грашовыя сродкі на разліковы рахунак Мінскай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў»: р/с 3015000000307 у ААТ «Беларусбанк», г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 18, код 975, УНП 100534074 з паметкай «Партфель першакласніка». Партфелі, напоўненыя дабрачыннымі падарункамі, уручаць дзецям 26 жніўня ў кінатэатры «Піянер».

**Надзея ПАЎЛАВА, Святлана БУСЬКО.**

БПС-СБЕРБАНК

С 16.07.2015 ОАО «БПС-Сбербанк» снижает размер процентов по заключенным с 30.12.2014 по 31.12.2014 (включительно) договорам в долларах США и евро срочного банковского депозита «Доверяй +» с действующей процентной ставкой 8,0% и 8,5% на 1,8 п.п. и 2,3 п.п. соответственно – до 6,2% (годовых).

Установленный размер процентов будет применен с 16.08.2015 года.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по единому короткому номеру 148.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»